ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (1023). ● ЧАЦВЕР, 27 верасня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## АРГАНІЗАВАНА КАФЕДРА

Тры гады існуе ва універсітэце факультэт прыкладной матэматыкі. Ён быў створан на базе кафедр вылічальнай матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і прыкладной матэматыкі матэматычнага факультэта і новых — ураўненняў матэматычнай фізікі і матэматычнага забеспячэння ЭВМ. У наступныя гады былі сфарміраваны кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнага забеспячэння АСК.

К гэтаму навучальнаму году на факультэце створана кафедра агульнага праграміравання пад кіраўніцтвам Генадзя Антонавіча Драбушэвіча. Па колькасці членаў яна самая шматлікая на факультэце—24 чалавекі—і самая маладая па ўзросту. Ёсць тут і вопытныя выкладчыкі — Часлаў Мікалаевіч Роліч, Уладзімір Васільевіч Гарачкін, але асноўны састаў — гэта выпускнікі матэматычнага факультэта і прыкладной матэматыкі апошніх год.

Аб планах бягучага года Г. А. Драбушэвіч расказвае:

— Кафедра была арганізавана з мэтай паляпшэння выкладання агульнага курса «Вылічальныя машыны і праграміраванне» і правядзення вучэбнай практыкі на ЭВМ. Члены кафедры будуць весці курсы на факультэце прыкладной матэматыкі, спецыяльным ФПМ і геаграфічным. Дзве групы студэнтаў пройдуць спецыялізацыю па праграмнаму забеспячэнню АСК.

**В. БЯЛЯЎСКАЯ.**

## ПА ШКОЛЬНАМУ ЗВАНКУ



Зусім нямнога часу засталося да апошняга званка ва універсітэце. А зараз студэнтка V курса гістфака Аня Папавіцкая жыве па школьнаму званку. У школе № 103 ён такі ж залівісты, як і на родным факультэце, але кліча дзяўчыну не слухаць лекцыі, а самой даваць урокі. А гэта, ой, як нялёгка, калі ўлічыць, што слухачы — вучні.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

(Заканчэнне на 2-й стар.).



## У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

Ідзе падрыхтоўка да справаздачна-выбарных сходаў. З 5 па 20 кастрычніка яны пройдуць на 10 факультэтах універсітэта. Павестка дня: «Аб рабоце камітэта камсамола па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ і XXIV з'езда ЛКСМБ і задачах па далейшаму ўдасканаленню камуністычнага выхавання моладзі». 25 кастрычніка адбудзецца XXV агульнауніверсітэцкая камсамольская канферэнцыя.

●

Штаб працоўных спраў працягвае работу па накіраванню на ўдарныя будоўлі рэспублікі тых абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсу ў БДУ.

●

Яшчэ да пачатку навучальнага года сектар уліку пазнаёміў камсамольскіх актывістаў на факультэтах з інструктыўным пісьмом абкома камсамола аб парадку правядзення гадавой зверкі саставу членаў ВЛКСМ. Зверка пачнецца пасля вяртання студэнтаў з сельгасработ і закончыцца да справаздачна-выбарных сходаў.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**

Камсамольскае жыццё

## ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

Камсамольскія арганізацыі факультэтаў рыхтуюцца да справаздачна-выбарных сходаў. Таму вельмі важна сёння, падводзячы вынікі ўсёй работы камсамольскай арганізацыі на працягу мінулага навучальнага года, глыбока прааналізаваць асноўныя напрамкі камсамольскай работы.

Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі факультэт журналістыкі заняў другое месца ва універсітэце. Сярэдні бал склаў 4,19. І ў той час як на тварах некаторых камсамольскіх актывістаў можна было прачытаць задавальненне і нават заспакоенасць, камітэт камсамола факультэта прыняў пастанову: на ўсіх курсах у першыя ж дні другога семестра правесці камсамольскія сходы, на якіх падвесці вынікі сесіі.

Вельмі сур'ёзна падышлі камсамольскія актывісты да вырашэння пастаўленай задачы. Асноўны ўпор на сходах быў зроблен на выяўленні прычын нізкай паспяховасці некаторых студэнтаў. Усім ім устанавілі апошні тэрмін ліквідацыі запазычанасцей. На самых злосных парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны былі накладзены спагнанні. Многім у дапамогу былі выдзелены лепшыя студэнты.

Акадэмічны сектар, які ўзначальвае студэнтка III курса Ала Жаваранак, узяў пад свой кантроль увесь вучэбны працэс. На пасяджэннях пастаянна абмяркоўваліся пытанні вучобы, падрыхтоўкі да практычных і семінарскіх заняткаў, наведвання. З мэтай кантролю акадэмічны сектар разам са штабам «Камсамольскага пражэктара» пастаянна праводзіць тыдні кантролю за наведваннем заняткаў. Вынікі праверак абмяркоўваюцца на пасяджэннях акадэмічнага сектара, асобнымі пытаннямі ўключаюцца ў павесткі дня камсамольскіх сходаў у вучэбных групах, пасяджэнняў камітэта камсамола факультэта. Ім пастаянна адводзіцца месца ў насценнай газеце факультэта «Журналіст» і ў «Камсамольскім пражэктары».

Экзаменацыйная сесія, як вядома, бывае страшнай толькі для тых студэнтаў, якія недзе штосьці недагледзелі ў працэсе вучобы, штосьці ўпусцілі ў ходзе падрыхтоўкі да экзаменаў. І найпершы абавязак камсамольскага актыву—своечасова выявіць такіх студэнтаў, пагаварыць з імі на камсамольскім сходзе групы і аказаць неабходную дапамогу. Менавіта аб адстаючых ішла гаворка на камсамольскіх сходах усіх груп яшчэ за месяц да пачатку сесіі.

Партыйная арганізацыя факультэта на адным са сходаў заслухала даклад аб рабоце камсамольскай арганізацыі па ўзмацненню ідэйна-палітычнага выхавання і ўмацаванню вучэбнай дысцыпліны студэнтаў. На сход былі запрошаны куратары, камсамольскія актывісты. Атрымалася цікавая і карысная размова. Пастанова партыйнага сходу была давездзена да кожнага камсамольца.

Камітэт распрацаваў «Палажэнне аб правядзенні конкурсу на лепшую акадэмічную групу». Асноўнымі паказчыкамі з'яўляюцца паспяховасць студэнтаў, актыўнасць іх у грамадскім жыцці групы, курса, факультэта. Мэта такога конкурсу — спрыяць арганізацыі спаборніцтва курсаў, вучэбных груп, прывіць студэнтам пачуццё калектывізму, гонару за сваю групу, за свой курс, за сваіх таварышаў.

Найвышэйшага напружання дасягае заключны этап, калі здача экзаменацыйнай сесіі паказвае ўсе плюсы і мінусы вучэбнай групы, курса ў цэлым, усёй падрыхтоўкі да выпрабаванняў. У гэты перыяд акадэмічны сектар вывешвае «Календары сесіі», куды заносяцца вынікі здачы экзаменаў кожным студэнтам. Гэта надае сацыялістычнаму спаборніцтву галоснасць, што вельмі важна. Падрыхтоўцы і самому ходу здачы сесіі прысвячаюцца спецыяльныя нумары насценнай газеты, дзе разам з вынікамі экзаменаў змяшчаюцца рэпартажы з аўдыторый, артыкулы камсамольскіх актывістаў, фотаілюстрацыі аб ходзе сесіі на факультэце. І, зразумела, ёсць у газеце і калонка гумару. Сатырычным пяром апісваюцца кур'ёзы, анекдатычныя гісторыі, што здараюцца на экзаменах.

Вынікі экзаменацыйнай сесіі падводзяцца на расшыраным пасяджэнні акадэмічнага сектара адразу ж пасля апошняга экзамена. За аснову прымаецца сярэдні бал групы, курса.

Чацвёртую сесію запар першае месца займае трэці курс. Яго сярэдні бал—4,4. Ніхто са студэнтаў курса не атрымаў нездавальняючых адзнак. Калі пасля зімовай экзаменацыйнай сесіі камсамольскае бюро курса аб'явіла вайну «тройцы», то гэта не было нечаканасцю.

Другое месца заняў чацвёрты курс. Яго сярэдні паказчык—4,29 бала. Першы і другі курсы здалі сесію некалькі слабей.

Падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва акадэмічных груп. І зноў жа першае месца заняла трэцяя група III курса. Дарэчы, гэта пачэснае месца яна ўтрымлівае ўжо на працягу чатырох сесій. Па выніках мінулага конкурсу група была прызнана лепшай на факультэце і заняла другое месца ва універсітэце. Яна была ўзнагароджана турысцкай паездкай у Брэст. Цяпер яе сярэдні бал склаў 4.52. Гэта своеасаблівы рэкорд факультэта. Такога высокага сярэдняга бала ў нас яшчэ не было. З дваццаці пяці студэнтаў групы толькі адзін атрымаў адну тройку.

Вялікая заслуга ў такім поспеху старасты групы, члена камітэта камсамола Уладзіміра Субата, сакратара камсамольскага бюро студэнткі-выдатніцы Людмілы Цімчанкі, камуністаў Уладзіміра Купрыенкі, члена камітэта камсамола факультэта, адказнага за спартыўную работу, Антона Клімовіча, старшыні студсавета нашага інтэрната, Алы Жаваранак, члена камітэта камсамола, адказнай за акадэмічную работу.

У цэлым факультэт экзаменацыйную сесію здаў не горш, чым папярэднюю. Сярэдні бал зноў роўны 4.19.

Вынікі падведзены. Але зроблены і пэўныя вывады. Старшакурснікі здаюць экзамены значна лепш, больш сур'ёзна рыхтуюцца да іх. Значыць, камітэту камсамола асноўную ўвагу неабходна звярнуць на першы і другі курсы. Трэба нанава перагледзець усе планы работы камітэта камсамола і ў першую чаргу акадэмічнага сектара.

**М. НІКІШЫН,**
**сакратар камітэта камсамола факультэта журналістыкі.**

## СТРАДА ЗАВЯРШАЕЦЦА

Студэнцкая сельскагаспадарчая страда завяршаецца. З задавальненнем падвядуць яе вынікі ў тых атрадах, дзе працавалі заўзята, з камсамольскім агеньчыкам, не баяліся ніякай работы. Ды і ў гаспадарках застанецца добры ўспамін аб студэнтах-памочніках.

Праўда, не ўсё і не ўсюды было гладка і добра. Былі і спрэчкі, і прастоі, арганізацыйныя няўзгодненасці і парушэнні дысцыпліны. Нават даводзілася дэканам, сакратарам партыйных бюро факультэтаў рабіць няпланавыя выезды, каб на месцах высветліць абставіны надзвычайных здарэнняў, выправіць недахопы. Трэба сказаць, што кіраўніцтва факультэтаў аператыўна рэагавала на сігналы з месц студэнцкай працы. Так, на мінулым тыдні, напрыклад, калі ўзнікла пытанне, чаму не арганізавана харчаванне студэнцкага атрада IV курса біяфака ў Шчамысліцы, туды разам з прадстаўніком рэдакцыі выехалі сакратар партбюро Л. М. Лук'яновіч і дацэнт У. П. Ляхновіч. У гутарцы са студэнтамі, іх кіраўніком Т. І. Запольскай, дырэктарам вучэбнай гаспадаркі т. Грынцэвічам высветлілася, што на месцы арганізаваць харчаванне няма магчымасці. Ад прапановы ездзіць у сталовую ў горад студэнты самі адмовіліся: нязручна, траціцца многа часу. Паколькі жывуць члены атрада ў сваім інтэрнаце на Паркавай, а на работу іх падвозяць, то лепш рабіць невялікі абедзенны перапынак і харчавацца самім з тым, каб заканчваць работу ў 16 гадзін. На гэтым і пагадзіліся. Тут жа былі высветлены пытанні аб нормах, аплаце, аб'ёмах работ.

Як расказала камандзір атрада Ларыса Ляўковіч, усе студэнты стараюцца працаваць добра. Праўда, цяжэй таму, хто непрывычны да фізічнай працы, але тут дапамагаюць сябры. Атрад чацвёртакурснікаў біяфака працаваў на ўборцы яблык, рабіны чарнаплоднай. Дзяўчаты прапалвалі саджанцы дрэў, збіралі насенне. Найбольш цяжкія работы ўзялі на сябе хлопцы. В. Варганаў, А. Зарыхта, У. Ляхавец, Д. Трацякоў, А. Драбязка загружалі машыны фруктамі, выконвалі земляныя работы.

— Працуюць добра, дружна, — пацвердзіла і Тэліна Іванаўна Запольская.

**А. АЛЕНІЧ.**

## ПРАЦУЮЦЬ ПА-ЎДАРНАМУ

На мінулым тыдні прадстаўнікі прафкома універсітэта разам з работнікамі паліклінічнага аддзялення наведалі студэнтаў, якія працуюць у Чэрвеньскім раёне. Мы пабывалі ў трох гаспадарках: на эксперыментальных базах «Новыя Зялёнкі» і «Натальеўск», у саўгасе імя Мічурына. Пазнаёміліся з бытавымі ўмовамі студэнтаў, урачы правялі выбарачны медагляд, аказалі дапамогу хворым.

Паездка паказала, што візіты ўрачоў вельмі патрэбныя. Па-першае, своечасова аказана медыцынская дапамога, па-другое, праведзены прафілактычныя мерапрыемствы. Таму варта задумацца над тым, каб у наступным годзе за кожным раёнам, дзе будуць працаваць нашы студэнты, замацаваць урача і рабіць такія наведванні па графіку.

На эксперыментальнай базе «Новыя Зялёнкі» працуюць студэнты II—IV курсаў аддзялення палітэканоміі гістфака. Кіраўнікі гаспадаркі стварылі для байцоў сельгасатрадаў добрыя ўмовы: прадукты адпускаюцца па сабекошту, абсталявана сталовая. На гэтыя клопаты студэнты адказваюць ударнай працай — паўтары нормы ў дзень! Першакурснікам гістфака, што працуюць у «Натальеўскім», даводзіцца нават напамінаць пра адпачынак. Хлопцы і дзяўчаты не шкадуюць сіл у рабоце. Паміж асобнымі атрадамі разгарнулася спаборніцтва.

А вось у атрадаў філалагічнага факультэта, якія працуюць у саўгасе імя Мічурына, бытавыя ўмовы няважныя. Нават кухонны кацёл стаіць пад адкрытым небам. Але хоць і з цяжкасцямі, абеды філолагі гатуюць смачныя.

У Чэрвені мы гутарылі з другім сакратаром райкома камсамола Альбертам Ніціеўскім. Ён расказаў, што пры райкоме камсамола таксама створаны брыгады, якія наведваюць калгасы і саўгасы. У асноўным усе студэнты універсітэта працуюць добра.

**А. ЖЫЛІНСКІ,**
**намеснік старшыні прафкома.**



## ПА ШКОЛЬНАМУ ЗВАНКУ

(Пачатак на 1-й стар.).

**Перагорнута шмат літаратуры, зроблен канспект урока. Але ўсё ж кансультацыя з сябрамі не перашкодзіць. У прасторнай настаўніцкай у Ані, Іры і Мікалая ёсць свой утульны куточак.**

**Усе яны другі год праходзяць практыку ў гэтай школе. Працоўны дзень будучых настаўнікаў працягваецца яшчэ доўга пасля заканчэння заняткаў у школе: спачатку абмеркаванне ўрока з метадыстам школы Л. С. Храловічам, потым — падрыхтоўка да заўтрашніх урокаў.**











# ВЫПРАБАВАННЕ НА СТАЛАСЦЬ

**Верасень для студэнтаў V курса—пачатак самага важнага, завяршаючага этапа ў падрыхтоўцы маладога спецыяліста — вытворчая, пераддыпломная практыка. Яна заклікана замацаваць і паглыбіць тэарэтычныя веды студэнтаў, прывучыць іх самастойна і творча рашаць практычныя задачы.**

**Вялікая арганізацыйная і вучэбна-метадычная работа па павышэнню якасці практыкі праводзіцца на кафедрах геаграфічнага, юрыдычнага, фізічнага факультэтаў, на факультэце журналістыкі і іншых. Выкладчыцкія калектывы гэтых факультэтаў устанавілі цесныя сувязі з прадпрыемствамі і ўстановамі, на якіх праводзіцца практыка, перапрацавалі праграмы і метадычныя ўказанні.**

**Цяпер 1182 студэнты IV—V курсаў юрыдычнага, матэматычнага, хімічнага факультэтаў, факультэтаў прыкладной матэматыкі і журналістыкі праходзяць вытворчую практыку ва ўсіх кутках Беларусі. Акрамя таго, 123 студэнты фізічнага, хімічнага, біялагічнага, матэматычнага факультэтаў выязджалі на практыку ў Балгарыю, ГДР, Польскую Народную Рэспубліку. І цяпер 40 студэнтаў хімічнага, матэматычнага і філалагічнага факультэтаў практыкуюцца ў Іенскім універсітэце імя Ф. Шылера.**

**Геаграфія месц практыкі вельмі абшырная. Так, у Гомелі — у пракуратуры і нарсудзе — пазнаюць сакрэты сваёй прафесіі студэнты IV курса юрыдычнага факультэта В. Бандарэнка, А. Юрчанка, І. Міхеева, А. Дудзіч; у газеце «Гомельская праўда»—студэнты V курса журфака С. Барысаў, Г. Хвошчанка; у абласным Камітэце па тэлебачанню і радыёвяшчанню — А. Міхальчанка; пяцікурснікі хімічнага факультэта Н. Кучарава, З. Хацкевіч, Г. Зорына — на шклозаводзе імя Ламаносава. Месцам практыкі для будучых хімікаў Л. Суравай, В. Задоры, Л. Лютаровіч стаў Навапалацкі нафтаперапрацоўчы завод. У пракуратуры і судзе горада Навапалацка зараз праходзяць практыку пяцікурснікі юрфака Г. Шчокіна, Г. Башун і іншыя.**

**Толькі ў адным раёне Мінска, Кастрычніцкім, цяпер знаходзіцца на практыцы ў пракуратуры і ў судзе 14 студэнтаў, на заводзе медпрэпаратаў — 4 студэнты-хімікі, 24 фізікі, 6 матэматыкаў працуюць на розных заводах раёна.**

**Многія студэнты праходзяць практыку па месцу сваёй будучай работы (яны ўжо прайшлі камісію па размеркаванню маладых спецыялістаў). Іх рабочыя праграмы практыкі з'яўляюцца часткай агульнай задачы, якая рашаецца прадпрыемствам, установай, і, як правіла, носяць прыкладны і навукова-даследчы характар.**

**Для студэнтаў-практыкантаў на прадпрыемствах і ва ўстановах чытаюцца лекцыі, іх знаёмяць з асноўнымі тэхналагічнымі працэсамі, з пытаннямі аховы працы, з кірункамі праводзімых даследаванняў і вопытна-канструктарскіх работ, з існуючай і навейшай тэхналогіяй.**

**Студэнты - практыканты прымаюць удзел у рабоце навуковых семінараў і ў грамадскім жыцці калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў.**

**У. МУХАЕЎ,**
**загадчык вытворчай практыкі БДУ.**



# ЖЫЦЦЁ—ПОДЗВІГ

**Сёння спаўняецца 70 год з дня нараджэння слаўнай дачкі беларускага народа Веры Захараўны Харужай. Гэтай даце прысвячаюцца лекцыі і гутаркі ў студэнцкіх групах і інтэрнатах, экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

КАЛІ Вера пачала рэвалюцыйную дзейнасць у падполлі Заходняй Беларусі, ёй было ўсяго 20 год. Але, нягледзячы на маладосць, яна валодала лепшымі якасцямі камуніста-падпольшчыка. У пачатку 1924 года ў рабочым прыгарадзе Беластока пасялілася маладзенькая настаўніца Вераніка Карчэўская. Гэта была Вера Харужая. У раёнах дзейнасці падпольшчыкаў жылі беларусы і палякі, яўрэі і літоўцы. Як сведчылі яе таварышы па падполлю, яна добра ведала беларускую мову. Па-польску, праўда, гаварыла не зусім правільна, даволі гладка гаварыла па-яўрэйску. Добра гаварыла па-руску. Іменна веданне моў —гэтай зброі барацьбы — дапамагала Веры найбольш плённа праводзіць арганізацыйную, прапагандысцкую і агітацыйную работу. Яна выступала з палымянымі прамовамі ў вёсках і мястэчках Палесся, Слонімшчыны, Навагрудчыны. Арганізоўвала камсамольскія ячэйкі, раённыя і гарадскія камітэты, дапамагала ствараць юнацкія секцыі ў прафсаюзах.

У яе была цудоўная здольнасць запальваць моладзь сваім рэвалюцыйным пафасам.

Пры актыўным удзеле Веры Захараўны колькасць камсамольцаў Заходняй Беларусі павялічылася за два гады ў дзесяць разоў. Пад кіраўніцтвам Харужай летам 1925 года праходзіла II канферэнцыя камсамола Заходняй Беларусі. Яна ўдзельнічае ў рабоце II канферэнцыі КПЗБ (Вільня) і III з'езда Кампартыі Польшчы.

Аднак небяспека падпольноўвала яе штодзень, шточас. Дэфензіва напала на след падпольшчыцы. 15 верасня 1925 года на адной са сваіх кватэр у Беластоку яна была арыштавана.

Веру даставілі ў лагер, дзе яе дапытвалі шэф Беластоцкай дэфензівы і інспектар палітычнай паліцыі Варшавы. Допыт нічога не даў. Пратакол не быў запоўнен. Барацьба працягвалася.

З першых жа дзён Вера ўключылася ў нябачную для чужых вачэй напружаную палітычную работу. Яе выбралі старшай пакоя. Не адкладваючы, даведалася, якая адукацыя ў таварышаў, прадумала праграму заняткаў, склала расклад. Трэба было напружана вучыцца і самой.

Следства цягнулася пятнаццаць тыдняў. Веру перавялі ў Брэсцкую турму. Тут ёй уручылі абвінаваўчы акт, у якім пералічваліся яе шматлікія «злачынствы» супраць польскай буржуазнай дзяржавы. 10 студзеня 1927 года адбыўся «працэс 31-го». Веру прыгаварылі да шасці гадоў турмы. На гэтым працэсе Вера Захараўна выступіла з палымянай прамовай у абарону Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Гэтак жа мужна трымалася Вера і на «працэсе 133-х». Гэта быў працэс над кіруючым ядром Кампартыі Заходняй Беларусі. Арганізатары працэсу прыклалі ўсе намаганні, каб узвесці ілжывыя абвінавачанні на Кампартыю. Трэба было даць ім знішчальны адпор. Партыйны камітэт турмы прапанаваў групе падпольшчыкаў выступіць на судзе з прамовамі ў абарону партыі, камсамола, прафсаюзаў. Сем камуністаў прынялі ўвесь удар на сябе, і сярод іх была Вера Харужая.

Судзілішча закончылася магутнай антыфашысцкай дэманстрацыяй, якую арганізавалі зняволеныя.

І зноў турма. Прыгавор быў суровым: восем гадоў зняволення. Але яна не скарылася. Доўгія гады турэмнай няволі не зламалі рэвалюцыянерку. Яна ўзначальвае палітшколу па ліквідацыі непісьменнасці сярод зняволеных, вядзе шырокую ініцыятыўную перапіску з сябрамі і бацькамі, з саратнікамі па барацьбе. Пісьмы яе сведчылі аб непахіснай адданасці Камуністычнай партыі. У 1931 годзе ў выдавецтве «Маладая гвардыя» пісьмы былі выдадзены. Надзежда Канстанцінаўна Крупская пісала ў «Правде»: «Гэтыя пісьмы выклікаюць моцнае ўражанне... Напісаны яны проста, шчыра. Пасля кожнага радка глядзіць на вас чалавек магутнай волі, перакананы рэвалюцыянер, барацьбіт за рабочую справу...»

У 1932 годзе па дагаворанасці паміж урадамі СССР і Польшчы быў праведзен абмен палітзняволенымі. У лік тых, хто падлягаў абмену, уваходзіла і Вера Харужая.

РАДАСНАЯ сустрэча з Мінскам, абдымкі родных і сяброў... Кароткі адпачынак, лячэнне і зноў работа. Яна рэдагуе падпольныя выданні КПЗБ, затым у 1935 годзе едзе на адну з важнейшых будоўляў другой пяцігодкі — Прыбалхашбуд. Зноў, як і раней, спраў у інструктара райкома партыі Харужай было шмат. Увесь свой час праводзіла яна сярод людзей: то на прыстані, то на будаўніцтве ТЭЦ, то на часовай электрастанцыі, у квартале «А», дзе будаваліся першыя шматпавярховыя дамы. Па яе ініцыятыве вялася вучоба малапісьменных, партыйная вучоба, адкрыўся рабфак.

1939 год—год вызвалення Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў. Веру нястрымна цягнула туды, дзе яна правяла сваю баявую маладосць, дзе клікала народ на барацьбу за сваё вызваленне. І яна вярнулася ў Беларусь. Працавала спачатку ў Целяханах, потым у Пінскім абкоме партыі. Гэта было шчасце. Шчасце жыць на вызваленай зямлі роднай Беларусі сярод свабоднага народу, у імя якога было прынесена столькі ахвяр. Шчасце будаваць новае жыццё, адчуваць побач локаць сапраўднага сябра, любімага чалавека, моцнага, смелага. Такім быў Сяргей Гаўрылавіч Карнілаў, былы ваенны лётчык, загадчык ваеннага аддзела Пінскага гаркома партыі.

Але нядоўга працягвалася мірнае спакойнае жыццё. На савецкую зямлю прыйшла вайна. І ўся краіна ўстала на смяротны бой з фашызмам, а разам з краінай—верная дачка беларускага народа Вера Захараўна Харужая. Яна і яе муж сталі першымі байцамі партызанскага атрада Васіля Захаравіча Каржа.

У адным з баёў загінуў Сяргей Гаўрылавіч Карнілаў. Вера мужна перанесла гэту страшную вестку. Горыч страты бясконца дарагога ёй чалавека толькі ўзмацніла нянавісць да нямецка-фашысцкіх акупантаў. І, нягледзячы на тое, што яна чакала дзіцяці, Харужая вырашыла застацца ў атрадзе, помсціць за Радзіму, за мужа, за дзяцей-сірот, сваіх, і не толькі сваіх.

Выконваючы заданні камандавання атрада па наладжванню сувязі са штабам партызанскага руху, Вера Захараўна восенню 1941 года перабіраецца цераз лінію фронту. Калі заданне было выканана, у ЦК КПБ ёй прапанавалі адправіцца ў эвакуацыю. Прыйшлося паехаць. Але праз некаторы час яна настойліва просіць накіраваць яе назад, за лінію фронту, даказваючы, што са сваім багатым вопытам канспіратыўнай работы, з веданнем моў яна будзе патрэбна там.

І Вера Захараўна дабілася свайго. Яе выклікаюць у ЦК КПБ і даручаюць арганізаваць групу для закідкі ў тыл. Нялёгка было адарваць ад сябе маленькіх дзяцей, але яна разумела: камуністка адказвае за ўсіх дзяцей на свеце.

УАДЗІН з дней 1942 года Вера Захараўна са сваёй групай перайшла лінію фронту. Дабраліся да торфапрадпрыемства «XX год Кастрычніка» пад Віцебскам, дзе базіраваўся партызанскі атрад М. Ф. Біруліна. Тут Вера Захараўна звязалася з арганізатарам абкома партыі, сакратаром Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б В. Р. Кудзінавым. Некаторы час вывучалі абстаноўку ў Віцебску. Вера Захараўна шукала магчымасць хутчэй перакінуць усю групу і пачаць дзейнічаць. Дзяўчатам належала адкрыць майстэрню і ў далейшым дзейнічаць пад выглядам белашвей. Харужай адводзілася роля багатай камерсанткі, гаспадыні майстэрні. Але абставіны складваліся так, што перакінуць усю групу ў самае фашысцкае гняздо пакуль не прадстаўлялася магчымым. На разведку пайшлі Тоня Ермаковіч і Дуся Суракова.

1 кастрычніка ў Віцебску была ўжо і Вера Захараўна. Сям'я Вараб'ёвых прыняла яе як родную, і Харужая адразу ж прынялася за работу. Яна правярала дадзеныя ёй адрасы, заводзіла знаёмствы сярод мясцовых жыхароў. У той час у Віцебску існавалі маталікія падпольныя групы. Вера Захараўна наладжвала з імі сувязь. Вялікую ўвагу ўдзяляла разведданым. Харужая і яе людзі ўзялі пад нагляд важнейшыя ваенна-стратэгічныя аб'екты ў горадзе: аэрадром, чыгуначны вузел, Суражскае і Смаленскае шасэ. У сваіх данясеннях Вера Захараўна паведамляла аб складах боепрыпасаў, аб колькасці самалётаў на аэрадроме, аб перамяшчэнні і колькасці часцей, дакладна ўказвала аб'екты для ўдараў савецкай авіяцыі, паведамляла вынікі бамбёжкі і г. д.

Хвалюючым дакументам аб жыцці, настроях і непахіснай волі савецкіх людзей, трапіўшых пад часовую акупацыю, з'яўляюцца яе пісьмы з Віцебскага падполля. Усяго яна напісала 12 пісьмаў. Апошняе датавана 6 лістапада 1942 года. У лістападзе Вера Захараўна разам са сваімі сяброўкамі Соф'яй Панковай, Еўдакіяй Сураковай, Клаўдзіяй Болдачавай і сям'ёй Вараб'ёвых была арыштавана. Прычына правалу да гэтай пары застаецца тайнай. Невядомы і канкрэтныя абставіны гібелі падпольшчыц. Па апошніх даных, усіх іх расстралялі ў снежні 1942 года ў Ілаўскім рове.

Праз 17 год пасля герэічнай смерці Веры і яе сяброўак савецкая грамадскасць з адабрэннем сустрэла Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Веры Захараўне Харужай пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**прафесар.**

(Заканчэнне. Пачатак у № 24).

# НАРАЧАНСКІЯ СУСТРЭЧЫ

**Штогод у час летніх канікул па маршрутах Беларусі падарожнічаюць замежныя студэнты, якія вучацца ў вну нашай краіны.**

**Аўтапоезд «Дружба» гасцінна сустракаюць хлебаробы і піянеры, працаўнікі вытворчасці і сябры-студэнты.**

**Шчодра раскрывае Беларусь сваю прыгажосць, знаёміць з помнікамі гісторыі і культуры народа.**

**Сардэчнасцю і цеплынёй былі прасякнуты сёлетнія сустрэчы на Нарачы ў спартыўна-аздараўленчым лагеры БДУ. Аб гэтым расказваюць здымкі нашага фотакарэспандэнта М. Нечыпарэнкі.**







# Вячэрнікі? Вячэрнікі!

Пасля працоўнага дня яны спяшаюцца не дадому а ў аўдыторыі. Заліваецца універсітэцкі званок. Нехта на хаду скідае паліто, нехта ўспомніў раптам, што забыў дома канспекты. А тут яшчэ ліфт на рамонце!

Але ўсе паспяваюць. І вось ужо ўвесь першы курс вячэрняга аддзялення гістфака сабраўся ў сваёй 606-й. Яны падобны на ўсіх студэнтаў свету: гэтак жа шумліва перагаворваюцца, гартаюць падручнікі, але ўсё-такі яны іншыя.

Нейкія нязначныя дэталі ў гутарках, адзенні, нават у рухах пераконваюць, што гэта — дарослыя, самастойныя людзі.

Як толькі Ядзвіга Паўлаўна Навуменка ўваходзіць у аўдыторыю, адразу становіцца ціха. Гісторыю СССР паспелі палюбіць усе. А Валя Якубовіч і Вольга Свірыдзюк сцвярджаюць, што гэта — самы цікавы прадмет.

— Ой, як захапляюча Ядзвіга Паўлаўна расказвае!

— А прыклады прыводзіць — ніколі не забудзеш!

Для іх незвычайна і цікава ўсё: і само знаходжанне ва універсітэце ў якасці студэнтаў, і такія таямнічыя навукі, што пакрысе раскрываюцца перад імі: гісторыя старажытнага Усходу, гісторыя першабытнаабшчыннага ладу.

Перапынак, як і ўсе перапынкі, гамантлівы і звонкі. Дзяўчаты ў кутку частуюцца бутэрбродамі. Адна з іх жартуе: «Вячэрнікі вячэраюць»... Знаёмімся: Таня Жыгалка, Зоя Нетук і Зіна Буйко. Розныя па ўзросту і па прафесіі. Сустрэліся ўпершыню месяц назад за гэтай самай партай. Пасябравалі.

Зою Нетук у школе № 125, дзе яна працуе настаўніцай пачатковых класаў, усе завуць Зояй Пятроўнай. Адразу ж пасля заканчэння Аршанскага педвучылішча Зоя вырашыла, што будзе вучыцца далей, і іменна на гістарычным. Пасля ўрокаў сама садзілася за падручнікі.

Хораша, крыху сарамліва ўсміхаецца дзяўчына:

— Ведаеце, вельмі люблю дзяцей.

Зіна Буйко — медсястра. Працуе ў НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. Гістфак для яе—гэта не проста даніна модзе. Гэта сур'ёзна і надоўга. Ужо зараз уяўляе Зіна, як увойдзе ўпершыню ў клас і скажа...

Ды хіба так важна, што яна скажа! Важна іншае: чалавек на сваім месцы.

**Л. ДРУЗЕВА.**

# НОВЫ ЛЕКТОРЫЙ

З кастрычніка арганізацыя таварыства «Веды» БДУ адкрывае новы цыкл лекцый «Інтэлектуальная праца ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі», які будзе праходзіць у актавай зале БДУ. Для чытання лекцый запрошан доктар філасофскіх навук, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Я. С. Жарыкаў.

## ПРАГРАМА ЦЫКЛА

### Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і разумовая праца

Сучасная навукова-тэхнічная рэвалюцыя, яе дасягненні і праблемы. Інтэлектуальны патэнцыял. Патрабаванні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі да спецыялістаў разумовай працы. Магчымасці і прадпасылкі павышэння прадуктыўнасці інтэлектуальнай дзейнасці. Інтэлектуальная гімнастыка і інтэлектуальны камфорт. Фізічная культура работнікаў разумовай працы. «Інтэлектуальныя» музычныя праграмы. Цветамузыка. Цветавая гімнастыка. Тэхнічная рэлаксацыя. Творчая цішыня. Светапогляд і інтэлектуальны працэс.

### Распазнаванне разумовых здольнасцей.

Няма неталенавітых людзей, ёсць людзі, якія заняты не сваёй справай. Магутнасць, тып і профіль інтэлекту. Здольнасць, таленавітасць, геніяльнасць. Метады распазнавання разумовых здольнасцей. Прагназіраванне інтэлектуальных магчымасцей асобы. Чалавек — справа.

### Інтэлектуальная гімнастыка

Праграмы разумовага самаўдасканалення. Патрабаванні кампенсаторыкі. Метады развіцця памяці. Трэніроўка мыслення. Ініцыяцыя ўяўлення. Паскоранае чытанне. Суггесталогія. Эўрыстыка і эрыстыка. Прыклады задач і практыкаванняў.

### Калектыўны інтэлект

Перавагі калектыўнай творчасці. Прынцыпы пабудовы і функцыяніравання групавога інтэлекту. Праблема сумяшчальнасці. Дзелавыя нарады. «Мазгавая атака». Стымуляванне дзейнасці. Канфліктныя сітуацыі. Кіраўнік. Калектыўная работа і індывідуальная творчасць.

### Будучыня чалавечага інтэлекту

Фізічныя і хімічныя сродкі рэгулявання разумовай працы. Магчымасці непасрэднага ўвядзення інфармацыі ў мозг. Загрузка падсвядомасці. Гіпноз. Сімбіёз машыны і чалавека. «Разумныя» жывёлы. Апярэджваючае навучанне. Адзіная навуковая мова. Транспарт інфармацыі. Цэнтральны інтэлект. Навука камуністычнага грамадства.

Аб часе лекцый будзе аб'яўлена дадаткова. Абанементы можна набыць у камітэтах камсамола.



Асенні парк. Фотаэцюд **Д. Чаховіча.**

# АХВЯРЫ НЕАСЦЯРОЖНАСЦІ

У дзяржаўтаінспекцыю часта паступаюць сігналы аб няправільных паводзінах на дарогах студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Летам гэтага года па асабістай неасцярожнасці пры пераходзе дарогі была збіта транспартам і атрымала цяжкую траўму асістэнтка кафедры ЭВМ Вольга Ганчарова. Не пажадаў карыстацца тратуарам старшы выкладчык кафедры фізвыхавання Віталій Ліштван, які разам з прыяцелем ішоў па праезджай частцы дарогі. Ён, як і выкладчык факультэта прыкладной матэматыкі Якаў Радына, які зблытаў значэнне сігналаў светафора, быў збіт аўтамабілем. Абодва сталі ахвярамі ў нецвярозым стане.

А з пачатку года пры ўдзеле работнікаў і студэнтаў універсітэта ў горадзе адбылося 7 дарожна-транспартных здарэнняў, шэсць чалавек паранена. За грубыя парушэнні правіл вулічнага руху аштрафаваны на суму ад 3 да 10 рублёў кожны каля 130 студэнтаў і супрацоўнікаў.

Вадзіцелі транспарту, якія рухаецца па плошчы Леніна, абураюцца тым, як некаторыя пешаходы, у тым ліку студэнты, супрацоўнікі універсітэта, не думаючы аб небяспецы, перасякаюць праезджую частку дарогі ў любых напрамках, перабягаюць дарогу прама перад транспартам. Асабліва небяспечны ўчастак насупраць галоўнага ўваходу ва універсітэт, насупраць прыпынку транспарту агульнага карыстання ля скрыжавання вуліцы Берсана, а таксама ў канцы спуску са шляхапровада, які злучае плошчу Леніна з Маскоўскай вуліцай.

Кастрычнік — час восеньскага ўсесаюзнага месячніка бяспекі руху. Адміністрацыя, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі БДУ павінны ўдумліва падрыхтавацца да гэтай важнай агульнадзяржаўнай справы, спланаваць і правесці розныя выхаваўча - прафілактычныя мерапрыемствы, узяўшы за аснову шырокае азнаямленне студэнтаў і супрацоўнікаў з правіламі бяспекі руху, актывізаваць у гэтым напрамку работу насценнага друку, сатырычных выпускаў, радыёгазеты.

Вялікую растлумачальную работу належыць правесці таксама і сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія маюць асабісты транспарт.

Але галоўнае — паўсядзённая высокая дысцыпліна кожнага вадзіцеля і пешахода. У гэтым — аснова рашэння задач месячніка бяспекі руху.

**В. АНАНЫН,**
старшы інструктар
ДАІ УУС
Мінгарвыканкома,
капітан міліцыі.

# ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

**аб'яўляе прыём студэнтаў на 1973-1974 навучальны год на наступныя аддзяленні:**

**харэаграфічнае**
**рэжысёрскае**
**хормайстарскае**
**народных інструментаў**
**піянерскіх важатых**
**суддзяў і грамадскіх інструктараў па спорту**
**лектараў.**

Тэрмін навучання на рэжысёрскім і харэаграфічным аддзяленнях — тры гады, хормайстарскім і народных інструментаў — два гады, на астатніх — адзін год. Прымаюцца студэнты I—IV курсаў. Закончыўшыя факультэт атрымліваюць пасведчанне і права на працу па спецыяльнасці, набытай на адпаведным аддзяленні.

Пачатак заняткаў 15 кастрычніка. Заявы аб прыёме падаваць у камітэт камсамола, пакой № 207.

**Факультэт грамадскіх прафесій**
**Камітэт камсамола.**

# *ЗАХАПЛЯЮЧАЕ ПАДАРОЖЖА*

На днях перад супрацоўнікамі бібліятэкі БДУ выступіў дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Ю. А. Гусеў, які нядаўна вярнуўся з працяглай камандзіроўкі ў Францыю. Юрый Аляксандравіч расказаў пра дзейнасць савецкай дэлегацыі на Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, пра Парыж, яго жыхароў, мастацтва Францыі, пра работу бібліятэк. Нам вельмі цікава было даведацца пра асаблівасці бібліятэчнай справы ў Францыі, параўнаць яе пастаноўку з нашай сістэмай работы.

Цікавы, насычаны асабістымі ўражаннямі расказ Ю. А. Гусева дапамог нам зрабіць захапляючае «падарожжа». Спадзяемся, што яно будзе не апошнім.

**Т. МЕЛЬНІКАВА,**
**бібліятэкар.**

# КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

3 кастрычніка — 100 год з дня нараджэння В. Я. Шышкова (1873—1945), савецкага пісьменніка.

4 кастрычніка — у СССР праведзен паспяховы запуск першага ў свеце штучнага спадарожніка Зямлі.

4 кастрычніка — 1000 год з дня нараджэння Абу Рэйхана Мухамеда ібн Ахмеда Аль-Біруні (973—1048), сярэднеазіяцкага вучонага-энцыклапедыста.

5 кастрычніка — 30 год з дня гібелі (1943) членаў обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі.

7 кастрычніка 1949 года— абвяшчэнне Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

7 кастрычніка — Дзень настаўніка.

8 кастрычніка — 125 год з дня нараджэння П'ера Дэгейтэра (1848—1932), французскага кампазітара, аўтара музыкі гімна «Інтэрнацыянал».

8 кастрычніка — 100 год з дня нараджэння А. В. Шчусева (1873—1949), савецкага архітэктара.

12 кастрычніка 1967 года — Вярхоўны Савет СССР прыняў новы Закон аб усеагульным воінскім абавязку.

14 кастрычніка — Дзень працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

15 кастрычніка — 100 год з дня нараджэння А. Д. Стасавай (1873—1966), старэйшай дзяячкі рэвалюцыйнага руху.

19 кастрычніка 1971 года — адкрыццё Усесаюзнага злёту студэнтаў.

21 кастрычніка — Дзень працаўнікоў харчовай прамысловасці.

23 кастрычніка — 50 год назад пад кіраўніцтвам Э. Тэльмана пачалося паўстанне рабочых у Гамбургу.

24 кастрычніка — Міжнародны дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

26 кастрычніка — 100 год з дня нараджэння Н. А. Андрэева (1873—1932), савецкага скульптара.

27 кастрычніка — 125 год з дня смерці А. Е. Варламава (1801—1848), рускага кампазітара.

29 кастрычніка — Дзень нараджэння камсамола.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 Аб'ём—1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 05440 Зак. 1103. Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.